УДК 947.6

# УДЗЕЛ МОЛАДЗІ Ў САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ ЖЫЦЦІ ССРБ У 1922 Г.

***В.В. ДАНІЛОВІЧ***
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

1922г. быў другім годам ажыццяўлення новай эканамічнай палітыкі ў ССРБ. Ішло паступовае адраджэнне разбуранай рэвалюцыямі і войнамі народнай гаспадаркі савецкай Беларусі. У поўнай меры ўсе змены, звязаныя з НЭП, адбіваліся і на сацыяльна-эканамічным становішчы моладзі рэспублікі.

Праваднікам і апорай палітыкі кампартыі ў маладзёжным асяроддзі з'яўляўся камсамол, які імкнуўся адыгрываць актыўную ролю ў сацыяльна-эканамічным жыцці.

У ССРБ у 1922 г. расло беспрацоўе сярод юнакоў і дзяўчын. Пры гэтым КСМБ вельмі насцярожана ставіўся да індывідуальнага вучаніцтва ў прыватных прамысловых прадпрыемствах, што сведчыць аб прыярытэце ў яго дзейнасці ідэалагічных догмаў над здаровым сэнсам, і намагаўся ўзмацніць гэтую працу ў дзяржаўнай прамысловасці. Але гэтыя намаганні вялікага плёну не давалі, і ў выніку вялікая колькасць маладых людзей стаяла пад пагрозай распылення і дэкласавання з-за распаўсюджанасці сярод іх п'янства і эканамічных злачынстваў [1, л. 3; 4, л. 2].

Праведзеныя ў красавіку 1922 г. маладзёжныя беспартыйныя канферэнцыі паказалі, што да 99 % моладзі савецкай Беларусі былі непісьменныя, а ахова працы юнакоў і дзяўчын не выконвалася [2, л. 23]. Летам 1922 г. з-за беспрацоўя і эксплуатацыі на прыватных прадпрыемствах назіралася гранічна дрэннае становішча нават працуючых маладых людзей рэспублікі, у выніку чаго сярод іх было распаўсюджана п'янства [3, л. 8].

Да таго ж у ССРБ назіраліся развіццё эпідэмічных захворванняў і масавыя скарачэнні з працы на прадпрыемствах нават камсамольцаў [1, л. 8]. Такія абставіны прымусілі камсамол савецкай Беларусі ў сваёй сацыяльна-эканамічнай дзейнасці займацца пераважна дапамогай сваім членам.

У лютым 1922 г. КСМБ была арганізавана юнацкая секцыя пры народным камісарыяце аховы здароўя рэспублікі [2, л. 4]. Гэта юнсекцыя арганізавала рэспубліканскі медыцынскі агляд да 1 тысячы чалавек моладзі, з іх 40 % аказаліся хворымі, а 780 чалавек скарысталіся пуцёўкамі ў маладзёжны дом адпачынку [4, л. 7], які летам 1922 г. знаходзіўся ў дрэнным стане, бо была скарочана выдача харчавання для яго [2, л. 56]. Для харчавання прайшоўшых гэты агляд юнсекцыяй было атрымана ад наркамата аховы здароўя 100 пайкоў, якія былі размеркаваны па паветах: Бабруйск – 30, Барысаў – 25, Слуцк – 20, Мазыр – 15, Ігумен – 10 [1, л. 8].

У маі 1922 г. камсамольцы арганізавалі юнсекцыю аховы здароўя пры гарадскім аддзеле аховы здароўя ў Мінску. Яна аказвала дапамогу захварэўшым падлеткам дыетычным харчаваннем (з гэтай мэтай за ЦК камсамола ССРБ было забраніравана 50 пайкоў ЦДА), накіроўвала іх на спецыяльнае лячэнне, арганізоўвала аздараўленне падлеткаў у дамах адпачынку. Намаганямі гэтай юнсекцыі пры ЦДА была створана дыетычная сталоўка для моладзі, за якой браніравалася 45 пайкоў. Па Мінску з мая па кастрычнік 1922 г. быў размеркаваны 351 паёк, двухтыднёвыя пайкі атрымалі 522 чалавека, а месячныя – 90 чалавек. Усяго па Мінску дыетычным харчаваннем і домам адпачынку было забяспечана 789 чалавек. Дадзеная юнсекцыя супрацоўнічала і з міжнароднымі гуманітарнымі місіямі. Так, яна атрымала ад квакераў 60 пайкоў для забеспячэння экскурсій рабочых юнакоў і дзяўчын (пайкі былі перададзены ў сталоўку ЦК КСМБ), а таксама 24 камплекты адзення (перададзены камісіі па паляпшэнні быта камсамольцаў) [1, л. 7 – 8]. Такім чынам, бачым, што атрыманая гуманітарная дапамога накіроўвалася для забеспячэння камсамольцаў.

Увогуле да кастрычніка 1922 г. у дзейнасці камсамола савецкай Беларусі пераважала сацыяльна-эканамічная праца ў гарадах.

На вёсцы ж адзначалася пагаршэнне сацыяльна-эканамічнага становішча маладых людзей, і, каб палепшыць яго, яны ўсё больш сыходзілі толькі ў гаспадарчую дзейнасць. Пры гэтым вялікі недахоп моладзі адчуваўся ў саўгасах [3, л. 18, 41]. Затое КСМБ была добра праведзена кампанія па збору харчпадатку [1, л. 1 – 2], што сведчыць аб прыярытэце для камсамольцаў дадзенай кампаніі над вырашэннем надзённых сацыяльна-эканамічных праблем вясковай моладзі.

ПолесГУ

Звярталі ўвагу на сацыяльна-эканамічнае становішча маладога пакалення і прафсаюзы. Па пастанове тарыфна-эканамічнага аддзела УЦСПС № 480 ад 18 лютага 1922 г., у мэтах планамернага аднаўлення кваліфікаванай рабочай сілы і аховы працы рабочых-падлеткаў, аплата працы падлеткаў-вучняў на прадпрыемствах ажыццяўлялася са сродкаў для аплаты рабочых і служачых і вызначалася ў сувязі з узрастаннем кваліфікацыі поўнай тарыфнай стаўкай за скарочаны рабочы дзень ад 1-га да 6-га разрадаў 17-разраднай сеткі. У выпадку невыпрацоўкі вучнем нормы ці слабой паспяховасці ў занятках яму давалася толькі 75 % разраднай стаўкі. У выпадку непрыдатнасці вучня да вывучэння дадзенай прафесіі ён мог быць пераведзены на іншую працу ці звольнены ў агульным парадку. Усё гэта было абавязкова для ўсіх дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў і гаспадарак [5, л. 3].

Аднак у рэчаіснасці правы працуючых юнакоў і дзяўчын не захоўваліся.

У дзяржаўнай прамысловасці ССРБ не выконваліся нормы гадзін працы падлеткаў (на розных прадпрыемствах яны працавалі ад 2 да 8 гадзін у суткі), у аплаце іх працы адсутнічала сістэма. Перавод у вышэйшы разрад тарыфнай сеткі ажыццяўляўся па заяве падлетка. Адміністрацыя прадпрыемстваў не звяртала ўвагі на навучанне падлеткаў прафесіям. У харчовай і гарбарнай прамысловасцях увогуле ўсе маладыя людзі былі звольнены [4, л. 36].

Працэнт моладзі на прыватных прадпрыемствах у 3,5 разы перавышаў яе працэнт на дзяржаўных прадпрыемствах. У мястэчках назіраўся моцны рост дробнай прамысловасці, у якую ўцягваліся амаль выключна юнакі і дзяўчыны, як найбольш лёгка эксплуатуемая працоўная сіла. На прыватных прадпрыемствах, за рэдкім выключэннем на больш буйных з іх (5 – 8 рабочых), нормы гадзін працы падлеткаў таксама не захоўваліся. Існавала здзельная аплата па няправільнаму тарыфу. Адсутнічаў сістэматычны кантроль за захаваннем правоў працуючых маладых людзей. У выніку саматужная моладзь актыўна ішла ў камсамол савецкай Беларусі і змагалася супраць гаспадароў [4, л. 36]. Апошні факт, з аднаго боку, сведчыць аб эфектыўнасці адстойвання КСМБ правоў сваіх членаў, а з другога боку – аб тым, што несаюзным юнакам і дзяўчынам ССРБ цяжка было адстойваць свае гарантаваныя дзяржавай правы.

Пасля IV з’езда камсамола савецкай Беларусі яго асаблівая ўвага была звернута на працу ўнутры прафсаюзнага руху (да гэтага часу сістэматычнай работы арганізацыі там не вялося). Па Мінску і паветах былі выдзелены камсамольскія прадстаўнікі ў праўленні прафсаюзаў. Для кіраўніцтва ўнутранай і знешняй эканамічнай працай камсамольцаў была створана адмысловая эканамічная камісія [1, л. 8]. Усё гэта сведчыць аб узмацненні увагі КСМБ да пазасаюзнай эканамічнай работы, што можна вытлумачыць жаданнем пашырыць свой уплыў на маладых людзей рэспублікі з дапамогай вырашэння іх надзённых эканамічных праблем. Зразумела, што для такой мэты найлепшым сродкам з’яўляліся прафсаюзы.

У выніку разгорнутай працы прафсаюзамі ССРБ былі прынятыя вылучаныя камсамольцамі дадатковыя пункты ў калектыўныя працоўныя дагаворы аб аплаце і ахове працы моладзі. Камсамол савецкай Беларусі правёў кампанію кантроля за прадастаўленнем абавязковых працяглых адпачынкаў для працуючых юнакоў і дзяўчын. Кампанія дала паспяховыя вынікі: за рэдкім выключэннем працуючыя маладыя людзі нават на прыватных прадпрыемствах атрымалі месячныя ці двухтыднёвыя адпачынкі [1, л. 8].

Асноўная ўвага надавалася працы ў тых прафсаюзах, дзе была сканцэнтравана найбольшая колькасць рабочай моладзі ССРБ (прафсаюзы гарбароў, швейпрама, харчавікоў, металістаў). У іх прадстаўнікі КСМБ хоць і несістэматычна, але імкнуліся праводзіць сходы маладых членаў прафсаюзаў, на якіх абмяркоўваліся як эканамічныя, так і прапагандысцкія пытанні (значыць камсамольцы выкарыстоўвалі эканамічную працу і ў прапагандысцкіх палітычных мэтах). Так, у прафсаюзе гарбароў было арганізавана 5 сходаў, у прафсаюзе швейпрама – 2, у прафсаюзе харчавікоў – 4, у прафсаюзе металістаў – 3. Аднак такія сходы не ахапілі яшчэ ўсіх працуючых юнакоў і дзяўчын. Акрамя гэтага ў Барысаве былі праведзены 2, а ў Слуцку – 1 беспартыйныя маладзёжныя канферэнцыі па вырашэнню эканамічна-прававых пытанняў. Камсамол савецкай Беларусі імкнуўся ўзняць адукацыйны ўзровень маладых людзей. З гэтай мэтай была праведзена кампанія накіравання рабочай моладзі ў вячэровыя школы [1, л. 8].

Не ва ўсіх прафсаюзах дзейнасць КСМБ была паспяховай. Так, слаба вялася праца ў прафсаюзе хімікаў, прадпрыемствы якога былі раскіданы па паветах і перажывалі буйны крызіс. Пры аддзелах аховы працы ў Мінску, Бабруйску, Барысаве і Слуцку працавалі камсамольцы-асістэнты інспектараў працы (па аднаму), але вельмі слаба. Найлепш праца камсамола савецкай Беларусі ў прафсаюзах была пастаўлена ў Слуцку і Барысаве, горш – у Мазыры і Бабруйску. Трэба адзначыць, што ў Слуцку і Бабруйску камсамольская прафсаюзная праца тармазілася ў сувязі з



Полесгу

тым, што большасць тамтэйшых рабочых юнакоў і дзяўчын – былыя камсамольцы і камсамолкі, якія прадузята ставіліся да працы саюза [1, л. 8]. Гэта сведчыць аб тым, што аўтарытэт арганізацыі сярод маладых людзей у свой час быў моцна падарваны, і яшчэ не ўсюды аднавіўся.

Увогуле дзейнасць КСМБ у прафсаюзах ССРБ на дадзеным этапе можна ахарактарызаваць як работу па наладжванню сувязяў і заваяванню аўтарытэта сярод рабочай моладзі.

Юнацкая секцыя ЦК камсамола савецкай Беларусі, арганізаваная пры народным камісарыяце працы рэспублікі, займалася барацьбой з беспрацоўем юнакоў і дзяўчын і прымала ўдзел у вырашэнні ўсіх маладзёжных канфліктаў у дадзеным народным камісарыяце, прафсаюзах і на прадпрыемствах [1, л. 8].

З красавіка 1922 г. камсамольцы адпраўляліся на працу толькі праз ЦК КСМБ і юнсекцыю пры біржы працы. Маладыя людзі яўрэйскай нацыянальнасці па разнарадцы размяркоўвалася на працу ў адмыслова арганізаваныя яўрэйскія фермы на вёсцы [2, л. 15, 25]. Арганізоўвалася пасылка моладзі на працу праз агульную адпраўку на працоўных біржах, дзе для юнакоў і дзяўчын вылучаўся пэўны працэнт ад атрыманых заявак на працоўную сілу. Такім шляхам за разглядаемы перыяд на сталую работу было накіравана 194 падлетка, а на часовую – каля 400 маладых людзей. З гэтай колькасці 19 чалавек цалкам знаходзілася на ўтрыманні прадпрыемстваў. У ліпені 1922 г. камсамолам ССРБ на прадпрыемствах рэспублікі было забраніравана 130 месц для моладзі, а для падлеткаў на працягу 1922 г. было забраніравана звыш 200 месц [4, л. 7; 6, л. 1].

Найлепш браніраваныя юнакі і дзяўчыны забяспечваліся ў Мінску. Тут для іх акрамя пайка адпускаліся сняданкі і была закуплена партыя чаравікоў, якія былі размеркаваны па павету. Звыш броні, у выніку спецыяльных перамоў юнсекцыі з шэрагам наркаматаў на працу было накіравана да 35 камсамольцаў, што гаворыць аб прыярыцеце іх інтарэсаў для дзяржавы. Аднак па ўсіх паветах савецкай Беларусі былі адзначаны злоўжыванні пры размеркаванні броні і пайкоў [1, л. 8], што сведчыць аб выкарыстанні шэрагам членаў КСМБ службовых пасад у мэтах асабістай карысці.

У якасці барацьбы з беспрацоўем маладых людзей юнсекцыя імкнулася развіваць індывідуальнае вучаніцтва. З гэтай мэтай на прадпрыемствах ССРБ браніравалася пэўная колькасць месцаў. У выніку ў якасці вучняў на прадпрыемствы былі накіраваны ў Мінску 110 чалавек, у Бабруйску – 35, Мазыры – 22, Барысаве – 20, Слуцку – 15, Ігумене – 10 чалавек. Па прапанове юнсекцыі, гаспадары прыватных прадпрыемстваў рэспублікі вызваляліся ад выдаткаў на сацыяльнае страхаванне і прамысловага падатку, калі арганізоўвалі індывідуальнае вучаніцтва падлеткаў на сваіх прадпрыемствах, бо дзяржаўныя прадпрыемствы не маглі заняць усю беспрацоўную моладзь. Для кіраўніцтва індывідуальным вучаніцтвам у рэспубліцы была створана адмысловая камісія з прадстаўнікоў юнсекцыі, камсамольскага ЦК, Савета прафсаюзаў, Галоўпрафадукацыі і Савета народнай гаспадаркі савецкай Беларусі пад старшынствам прадстаўніка ЦК камсамола ССРБ [1, л. 8], што сведчыць аб прызнанні важнасці ролі КСМБ у вырашэнні гэтага пытання.

Дзякуючы захадам юнсекцыі, штомесяц 20 – 25 беспрацоўных падлеткаў забяспечваліся сняданкамі са сталоўкі народнага камісарыята сацыяльнага забеспячэння, аднаразовая дапамога кожны месяц выдавалася 10 – 15 маладым беспрацоўным. Ва ўсіх паветах было ліквідавана беспрацоўе сярод камсамольцаў [1, л. 8] (значыць ім аддаваўся прыярытэт у працаўладкаванні).

У канцы 1922 г. у рэспубліцы налічвалася 442 афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных падлетка, з іх 116 – падлеткі да 16 гадоў, а 173 – падлеткі з сем’яў інтэлігенцыі. Таму толькі 153 беспрацоўных падлетка ў першую чаргу падлягалі адпраўцы на працу. Як бачым, нават і ў гэтым пытанні побач з узроставымі ўжываліся і класавыя абмежаванні. 202 падлеткі былі прымацаваны да прадпрыемстваў для навучання і ўтрымліваліся за кошт сродкаў асобнага фонду ЦК камсамола савецкай Беларусі, выдзеленых эканамічнымі нарадамі ССРБ. Забеспячэнне падлеткаў было дрэнным. Перавод іх на ўтрыманне прадпрыемствамі ішоў вельмі марудна. Навучанне на прадпрыемствах у цэлым вялося ніжэй здавальняючага [4, л. 36].

Такім чынам, юнсекцыя вяла даволі актыўную дзейнасць, хоць і не заўсёды паспяховую. Тым не менш яна карысталася пэўным аўтарытэтам сярод юнакоў і дзяўчын савецкай Беларусі.

Камісія КСМБ па паляпшэнню камсамольскага быту займалася не толькі размеркаваннем атрыманай гуманітарнай дапамогі сярод камсамольцаў. Акрамя гэтага яна здабывала сродкі і за кошт правядзення грашовых латарэй (5 мільярдаў рыблёў за разглядаемы перыяд). Таксама камісіяй была створана цырульня, дзе было занята пяцёра беспрацоўных членаў саюза. Гэта цырульня адлічвала ёй 5 % валавага прыбытку. Пры камісіі па паляпшэнню быта функцыянавала таксама сталоўка (больш 70 членаў камсамола ССРБ, прыбыўшых з паветаў былі забяспечаны ў ёй



Полесгу

па вострай патрэбе) [1, л. 8]. Усё гэта сведчыць аб добрым засваенні і выкарыстанні КСМБ у сваёй дзейнасці прынцыпаў НЭП.

Камісія кіравала прадастаўленнем кватэр камсамольцам. У выніку захадаў камсамола савецкай Беларусі народны камісарыят юстыцыі ССРБ прыняў пастанову аб прыцягненні ў якасці судовых засядацеляў прадстаўнікоў саюза і адлічэнні на карысць камісіі па паляпшэнню камсамольскага быту спаганяемых матэрыяльных сродкаў пры разглядзе судамі спраў па эксплуатацыі падлеткаў. Увогуле ў ажыццяўленні эканамічнай работы і аховы працы моладзі КСМБ была ўсталявана сувязь з судовымі органамі і да ўдзелу ў судах камсамол савецкай Беларусі імкнуўся прыцягнуць як мага больш маладых людзей [1, л. 8].

Праз камісію па паляпшэнню камсамольскага быту былі назапашаны сродкі для стварэння камсамольскага фонда ўзаемадапамогі [1, л. 8]. Камсамольцы, прыбыўшыя ў мінскія ВНУ, атрымлівалі з фонда ЦК КСМБ харчаванне і іншую дапамогу [2, л. 57].

Аднак асобныя члены саюзу прызвычаіліся сістэматычна атрымліваць дапамогу ад камісіі [4, л. 35]. Увогуле ж яе праца характарызавалася як слабая [1, л. 8]. Кіраўніцтва камсамола ССРБ патрабавала ад камісіі яшчэ большых высілкаў па здабыццю сродкаў.

Органы КП(б)Б выдаткоўвалі матэрыяльныя сродкі са сваіх фондаў на сацыяльна-эканамічную дзейнасць КСМБ. Дзякуючы ёй (медыцынскі агляд; арганізацыя дому адпачынку, дыетычнага харчавання, клубаў, спартыўных гурткоў, экскурсій; браніраванне месц на прадпрыемствах; сходы па вытворчасцям; вечары вытворчых камсамольскіх ячэяк), узмацнілася сувязь саюза з беспартыйнай моладдзю [3, л. 10].

Камсамольцы спрабавалі дапамагаць і іншым сацыяльна неабароненым катэгорыям савецкіх грамадзян. У маі 1922 г. камсамол савецкай Беларусі ўзяў на ўтрыманне 40 галадаючых дзяцей, якія былі разам з адпаведнымі матэрыяльнымі сродкамі для іх утрымання размеркаваны па паветах [2, л. 48]. Сярод членаў КСМБ быў праведзены збор каштоўнасцяў у на карысць галадаючых [3, л. 12]. Камсамол ССРБ браў шэфства над дзіцячымі дамамі і клубамі [2, л. 55; 6, л. 3]. Да кожнага дзіцячага дома быў прымацаваны камсамолец, які наведваў яго 2 – 3 разы на тыдзень для заняткаў з дзецьмі і вырашэння іх пытанняў. 1 – 7 жніўня 1922 г. КСМБ быў праведзены дзіцячы тыдзень у Мінску пад лозунгам арганізацыі дзіцячага руху ў Беларусі (інтэрнацыянальныя вечары; вечары дзяцей, гаворачых на адной мове, акцыі ў дзіцячых дамах, збор падарункаў з розных устаноў для падшэфных дзяцей). Камсамольцамі быў выведзены з пад уплыву меншавікоў яўрэйскі дзіцячы клуб у Мінску [7, л. 10] (значыць праца сярод дзяцей мела і палітычныя мэты). Таксама актыўна ўдзельнічаў камсамол ССРБ і ў тыдне інвалідаў [8, л. 2].

Такім чынам, у 1922 г. юнакі і дзяўчыны ССРБ не заставаліся ў баку ад сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, але іх сацыяльна-эканамічнае становішча было розным. На вёсцы, каб палепшыць сваё становішча маладыя людзі ўсё больш уцягвалася ў гаспадарчую дзейнасць, а ў горадзе, нягледзячы на ўсе захады, расло маладзёжнае беспрацоўе. Толькі падлеткі да 20 год у першую чаргу атрымлівалі ад дзяржавы і камсамола абарону сваіх правоў на працы і пэўную матэрыяльную дапамогу. Моладзь жа старэйшага ўзросту ў сацыяльна-эканамічным плане заставалася ў значнай ступені безабароннай.

Трэба адзначыць таксама, што даволі актыўную дзейнасць па абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў маладога пакалення савецкай Беларусі (галоўным чынам у горадзе) вёў КСМБ, які карыстаўся моцнай падтрымкай кампартыі і савецкай дзяржавы. Але прыярытэтам для яго заставалася абарона інтарэсаў сваіх членаў і выкарыстанне сацыяльна-эканамічнай працы ў палітычных мэтах.

## ЛІТАРАТУРА

1. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 12.
2. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 18.
3. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 13.
4. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 14.
5. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 15.
6. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 16.
7. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 15.
8. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 20.

## THE YOUTH IN SOCIAL AND ECONOMIC LIFE OF THE SOVIET SOCIALIST REPUBLIC OF BELARUS ON THE BEGINNING STAGE OF THE NEW ECONOMIC POLICY IN 1922

***V.V. DANILOVICH***

***Summary***

The article deals with the youth's position and role in social and economic life of the Soviet Socialist Republic of Belarus at the beginning stage of of the New Economic Policy implementing in 1922.

*Поступила в редакцию 27 мая 2009г.*

ПолесГУ